Настаўніцкая газета
28 мая 2009 года

С 8

# Настрой у "Арт-мажоры"

**Ужо семнаццаты раз у Мінску праходзіў фестываль мастацтваў "Арт-мажор" Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Сёлетні фестываль быў прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Году роднай зямлі.**

Гэта своеасаблівая справаздача вучэбных мастацкіх калектываў, творчых кафедр і факультэтаў універсітэта перад мінскім гледачом, публічная атэстацыя не толькі выкладчыкаў, але і студэнтаў. Фестывальныя мерапрыемствы праходзілі на працягу трох месяцаў на прэстыжных сцэнічных пляцоўках горада. Арганізатарам фестывалю з'яўляецца прадзюсерскі цэнтр "Арт-мажор" БДУ культуры і мастацтваў.

Фестываль пачаўся 17 сакавіка ў Палацы культуры Мінскага трактарнага завода канцэртам кафедры духавой музыкі. У рамках фестывалю таксама прайшлі канцэрты кафедры мастацтва эстрады, кафедры народна-інструментальнай творчасці, кафедры харавога і вакальнага мастацтва, кафедры беларускай народна-песеннай творчасці, справаздачны канцэрт кафедры харэаграфіі, Дзень факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва, Дзень факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый.

Гала-канцэрт фестывалю адбыўся 26 мая ў Белдзяржфілармоніі. У канцэрце прынялі ўдзел найлепшыя творчыя калектывы універсітэта, якія прадставілі найбольш яскравыя нумары. Гэта лаўрэаты міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў — творчыя калектывы, асобныя выканаўцы і выпускнікі універсітэта: капэла беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў "Гуды" (мастацкі кіраўнік І.Мангушаў), фальклорны ансамбль "Баламуты" (мастацкі кіраўнік К.Трамбіцкі), ансамбль кафедры харэаграфіі пад кіраўніцтвам С.Гуткоўскай, "Майстэрня эстраднага танца", ансамбль "Універсум", ансамбль акардэаністаў "Туці" і інш.

**Андрэй КАРЭЛІН.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ